# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення этна-вечарыны ”У вішнёвым садзе“ у межах Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення этна-вечарыны ”У вішнёвым садзе“ у межах Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“ (далей – этна-вечарына).

Мэтай і задачамі этна-вечарыны з’яўляюцца:

папулярызацыя, аднаўленне і захаванне беларускага народнага танца;

развіццё фальклорнага руху;

падтрымка і ўдасканаленне дзейнасці існуючых фальклорных калектываў.

2. Арганізатарамі этна-вечарыны з’яўляюцца Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт (далей – райвыканкам), аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама (далей – аддзел) (далей – арганізатары конкурсу).

Для ўдзелу ў этна-вечарыне запрашаюцца фальклорныя калектывы з Віцебскай вобласці, Рэспублікі Беларусь і замежных краін.

Заяўкі дасылаюцца на эл.адрас: glubokoe_ctknt@mail.ru;

тэлефоны для даведак: 8 02156 23007 (Наталія Уладзіміраўна), 8 02156 22420.

3. Умовы правядзення:

фальклорныя калектывы Беларусі і замежных краін прадстаўляюць мясцовы танец, народную гульню, фальклорную песню свайго рэгіёна з захаваннем адметнага стылю выканання.

4. Патрабаванні да ўдзельнікаў:

адпаведнасць касцюма натуральнаму абрадаваму дзеянню;

выступленне ўдзельнікаў ажыццяўляецца пад акампанемент музычных інструментальных ансамбляў або пад музыку традыцыйнага складу ў жывым гучанні;

касцюмы ўдзельнікаў уяўляюць сабой варыянты арыгіналаў або копій традыцыйных народных касцюмаў сваёй мясцовасці.

5. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў:

Усе калектывы-удзельнікі атрымліваюць дыпломы за ўдзел у этна-вечарыне.